View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

Азарка, В.У. Звышфразавае адзінства і тэкставы сегмент у прозе Кузьмы Чорнага /В.У.Азарка // Весці БДПУ імя М. Танка. — 1999. — № 4. — С. 50–55.

В. Азарка

# Звышфразавае адзінства і тэкставы сегмент у прозе Кузьмы Чорнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У фарміраванні літаратурнай мовы адметную ролю адыгрывае мова асобных пісьменнікаў. Не выпадкова даследаванне мовы мастацкіх твораў, вывучэнне індывідуальна-аўтарскага стылю заўсёды цікавіла моваэнаўцаў. Разам з тым у лінгвістычнай літаратуры яшчэ мала прац, прысвечаных асэнсаванню моўнага майстэрства аднаго з найбуйнейшых беларускіх празаікаў — Кузьмы Чорнага. Пільнай увагі патрабуе вывучэнне структурна-стылістычнай арганізацыі твораў пісьменніка, у прыватнасці даследаванне структуры тэкставых адзінак.

Сказ як мінімальная семантыка-сінтаксічная адзінка тэксту перадае адносна закончаную думку, характарызуе мінімальны адрэзак рэчаіснасці. Некаторыя сказы атрымліваюць канчатковае сэнсавае напаўненне толькі ў спалучэнні з іншымі камунікатыўнымі адзінкамі, у так званых складаных формах звязнай мовы — у звышфразавым адзінстве і тэкставым сегменце. Нягледзячы на тое, што названыя тэкставыя адзінкі вывучаюцца ўжо на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў, на сучасным этапе развіцця лінгвістыкі яшчэ няма адзінага крытэрыя іх вылучэння і класіфікацыі.

Тэрмінам **звышфразавае адзінства** (ЗФА) мы абазначаем групу звязаных паміж сабой сказаў, першы з якіх аўтасемантычны, а наступныя сінсемантычныя. Камунікатыўная залежнасць не дае магчымасці сінсемантычным сказам выконваць самастойную функцыю і патрабуе разглядаць іх як структурныя элементы адзінага цэлага, як кампаненты звышфразавага адзінства. Мы прытрымліваемся погляду Н.Д.Зарубінай, якая лічыць, што два аўтасемантычныя сказы не могуць складаць ЗФА [1]. Звязнасць ЗФА забяспечвае спецыфічная звышфразавая сувязь, якая злучае сінсемантычны сказ з тым кампанентам ЗФА, што ўдакладняе яго структуру

і змест. Ролю сродкаў звышфразавай сувязі адыгрываюць займеннікі, прыслоўі, часціцы, злучнікі, эліпсіс. Прааналізуем урывак з апавядання Кузьмы Чорнага “Буланы”:

*Ціха было, спакойна і ад гэтага паспакайнеў Буланы. Стаяў ён доўга на адным месцы, адчуваў, як хадзілі ў ім ад удушша пад шкурай рэбры, ды ўсё, задзёршы галаву, цягнуў у сябе паветра.*

*Стаяў усё ды дыхаў, узнімаў высока бакі…*

*І ўсё спакайней ды спакайней. На хвіліну нават уявілася, што зараз вось прыйдзе Раман Драгун, забярэ яго ды павядзе дадому, а там падкіне сена.*

*І тады ўжо пачаў хадзіць Буланы паволі ды грызці вільготную і халодную ад восені траву…*(Буланы. Т.1.С.329)[*].

ЗФА складаецца з шасці структурных элементаў, аб’яднаных адной мікратэмай — стан Буланага. Першы сказ камунікатыўна-моцны, аўтасемантычны: яго змест раскрываецца уласнымі лексічнымі сродкамі, а ў структуры няма фармальных адзнак, якія б паказвалі на неабходнасць яго дапаўнення элементамі іншых сказаў. Астатнія сказы сінсемантычныя. Іх адзнакай з’яўляюцца сігналы сінсемантыі — словы, якія сведчаць аб залежнасці камунікатыўнай адзінкі ад кантэксту. Сінсемантычнасць падкрэсліваюць непаўната структуры сказаў (*Стаяў усё ды дыхаў, узнімаў высока бакі… І ўсё спакайней ды спакайней*), выкарыстанне прыслоўя тады, якое паказвае на часавы момант, акрэслены раней (тады — калі *паспакайнеў*), ужыванне займеннікаў ён, яго замест назоўніка Буланы. Сінкрэтычны злучнік-часціца і ў пачатку апошняга сказа не толькі звязвае кампаненты ЗФА, але і сігналізуе аб завершанасці тэкставай адзінкі.

Такім чынам, звышфразавае адзінства — семантыка-сінтаксічная адзінка тэксту, якая характарызуецца своеасаблівай структурнай і семантычнай арганізацыяй. Гэта закончаная камунікатыўная адзінка здольная канкрэтызаваць прадмет апісання, дэтальна ахарактарызаваць пэўны аб’ект ці з’яву.

[*] Спасылкі даюцца па выданнях: **Чорны К**. Збор твораў у 8 тамах. Мн., 1972-1975. У дужках пазначаны назва твора, том і старонкі.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Некаторыя лінгвісты лічаць, што звышфразавыя адзінствы могуць уваходзіць у склад тэкставага сегмента — семантыка-сінтаксічнай адзінкі вышэйшага ўзроўню[2]. Мы разглядаем **тэкставы сегмент** (ТС) як аўтасемантычны адрэзак тэксту, спалучэнне некалькіх асобных аўтасемантычных сказаў і звышфразавых адзінстваў, аб'яднаных развіццём адной тэмы ці яе аспектаў. Для абазначэння падобнай тэкставай адзінкі мовазнаўцы карыстаюцца і іншымі тэрмінамі — прэдыкатыўна-рэлятыўны комплекс [3], тэматычны адрэзак [4], суперсінтаксічнае адзінства [5], фрагмент [6] і інш.

Прааналізуем пачатак апавядання Кузьмы Чорнага "На пыльнай дарозе", у дужках будзем пазначаць літарамі А і С адпаведна аўтасемантычныя і сінсемантычныя сказы, а лічбамі — іх парадкавы нумар:

*Паабапал жвірыстай* ***дарогі*** *калышыцца леташні быльнік, і веснавая шырыня вее над неабдымным* ***полем****. (А1) // Неба сіняе, сонечнае; над* ***дарогаю*** *тонкі, як туман, падымаецца* ***пыл*** *— плыве* ***вецер*** *з-за сініх лясоў, і на дзернавых узмежках пры жоўтых каляінах шуміць сухі палын… (А2)// Моцна думаюць голыя яшчэ* ***кусты****, а за імі, далей, пярэсцяцца колеры зямлі: зялёныя ўзгоркі, ціхія лагчыны, рэдкія чорныя палосы першай раллі і леташняя шэрань веснавой цаліны. (А3)//*

*Вецер прынёс аднекуль сухі жмут аўсянай саломы, прыпёр да сухога* ***быльнікавага куста****, растрасае патроху і разганяе па саломіне ў* ***полі****, салома звонка шалясціць і навявае задумённасць вялікай далечыні.(А4)//*

*Моцна шуміць яшчэ нейкае* ***зелле****, перазімаваўшае, падгніўшае, цяпер сухое і шэрае.(А5) У* <u>*яго*</u> *галоўках захаваліся, мусіць, зярняты — маленькія, порсткія птушкі гаварлівымі сем'ямі прылятаюць і клююць іх.(С6)// ЗФА-1*

***Дарога*** *— ад таго, што шырокая,* ***ветраная і пыльная*** *— вясёлая.(А7) Шырокі паварот з* <u>*яе*</u> *ў горад; горад блізка, і не відзен за блізкімі ўзгоркамі, і каля павароту куча бітых каменняў, пры зямлі абмалёваныя зялёным шлакам травы (С8)// ЗФА-2* (На пыльнай дарозе Т.1. С.371).

Вышэй адзначалася, што сінсемантычныя сказы не могуць выконваць самастойнай функцыі, таму яны пры дапамозе звышфразавай сувязі далучаюцца да

адпаведных аўтасемантычных сказаў, утвараючы пры гэтым звышфразавае адзінства. У прыведзеным прыкладзе знаходзім два звышфразавыя адзінствы. Сказы 5 і 6 утвараюць ЗФА-1. Выконваючы ролю азначэння ў сінсемантычным сказе (С5), займеннік яго адначасова паказвае на сувязь гэтага сказа з папярэднім аўтасемантычным кампанентам ЗФА, бо значэнне займенніка канкрэтызуецца дзейнікам прэпазіцыйнага сказа — назоўнікам зелле. Кампаненты ЗФА-2 (сказы 7-8) звязаны таксама пры дапамозе займенніка: назоўнік дарога — дзейнік аўтасемантычнага кампанента (А7) — канкрэтызуе значэнне займенніка яе, які з'яўляецца сігналам сінсемантыі сказа С8 і выконвае ролю сродку звышфразавай сувязі. Такім чынам, у склад прыведзенага тэкставага сегмента ўваходзяць два звышфразавыя адзінствы і чатыры асобныя аўтасемантычныя сказы — 1, 2, 3, 4.

У межах тэкставага сегмента акрамя граматычнай звышфразавай сувязі (злучае кампаненты ЗФА) дзейнічае і сэнсавая сувязь, якая праяўляецца праз лагічныя ўзаемаадносіны паміж структурнымі кампанентамі ТС, а таксама праз замяшчэнне паняццяў. У прыведзеным вышэй прыкладзе ролю сродкаў сэнсавай сувязі выконваюць паўтор лексем **дарога** (сказы А1, А2, А7), **вецер** (сказы А2 і А4), **поле** ( сказы А1 і А4), **кусты** (сказы А3 іА4) і паўтор аднакаранёвых слоў, якія належаць да розных граматычных класаў: **быльнік** (А1) — **быльнікавага** куста (А4); **пыл** (А2) — **пыльная** (А7); **вецер** (А2, А4) — **ветраная** (А7).

Сэнсава ўсе структурныя элементы прааналізаванага ТС падпарадкаваны загалоўку "На пыльнай дарозе", змест якога ўдакладняюць мікратэмы звышфразавых адзінстваў і асобных сказаў — быльнік на дарозе (А1), неба, пыл (А2), кусты, колеры зямлі (А3), вецер (А5), зелле (ЗФА-1), дарога і куча бітых каменняў на ёй (ЗФА-2).

Аб'яднанне звышфразавых адзінстваў і асобных сказаў у тэкставы сегмент абумоўліваецца агульнай тэмай гэтых адзінак. Разам з тым макратэма падзяляецца на мікратэмы, здольныя аб'яднаць асобныя сказы ў ЗФА. Атрымліваецца, што асноўная думка, ідэя тэкставага сегмента як бы ўдзельнічае ў канструяванні ўсіх адзінак, якія ўваходзяць у яго склад. Такім чынам, здольнасць тэкставага сегмента даваць мнагапланавую характарыстыку вызначаецца саставам звышфразавых

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адзінстваў і асобных аўтасемантычных сказаў, якія ўваходзяць у яго і характарызуюць розныя бакі аб’екта ці з’явы. Такі характар узаемадзеяння састаўных частак ТС дазваляе пісьменніку найбольш поўна раскрыць асноўны замысел мастацкага твора і данесці яго да чытача.

*Быў пагодлівы адвячорак, калі Пятро Тадаровіч з’явіўся дадому. (А1)// Пакульгваючы яшчэ крыху на хворую нагу, ён падышоў да дома, увесь трасучыся ад вялікай узбуджанасці. (С2)// Ён сапраўды чуў нават, як пахне трухлявы плацец каля хаты пад чырвонаю рабінаю. (С3)// Сонца свяціла ў сляпыя шыбы роднай хаціны. (А4)// Пад паветкаю насупраць хатніх акон ляжаў лом. (А5)// Мала яго было, але ён быў складзены рупліваю рукою. (С6)// Пасярод двара нейкія гнілыя, разламаныя начоўкі ну проста-такі ўсцешылі сэрца гэтага чалавека. (С7)// ЗФА1*

*— □ата прыйшоў! — закрычалі дзеці. (А8)//*

*І хвілін пяць была радасная ўрачыстасць. (С9)// Пасля адразу чалавек пайшоў аглядаць свае вуглы, усе закуткі ў двары. (С10)// Сям’я не адставала ад яго ні на крок (С11) // ЗФА2* (Семнаццаць год. Т.2. С.170*).*

У сказе А1 сфармулявана тэма тэкставага сегмента — вяртанне галоўнага героя дадому. Раскрыць гэтую тэму дапамагаюць мікратэмы ЗФА-1 (родны двор) і ЗФА-2 (сустрэча родных). На цесную сінтаксічную сувязь сказаў А1, С2, С3 і А5, С6 паказвае ўжыванне займеннікаў замест адпаведных назоўнікаў ( Пятро Тадаровіч — ён; лом — яго, ён). Выкарыстанне займенніка ў спалучэнні гэтага чалавека з’яўляецца сігналам сінсемантыі і сродкам сувязі дыстантна размешчаных сказаў А1 і С7. Ролю сродкаў сувязі кампанентаў ЗФА-2 выконваюць займеннік яго, прыслоўе пасля, злучнік і ў пачатку сказа. Сэнсавую цэласнасць тэкставага сегмента забяспечваюць словы, якія абазначаюць прадметы і паняцці, звязаныя з тэмай тэкставай адзінкі (*дом, двор, плацец каля хаты, шыбы роднай хаціны, паветка* ).

У тэкставым сегменце думка фармулюецца, распрацоўваецца і завяршаецца. Адпаведна ў структуры гэтай тэкставай адзінкі сэнсава вылучаюцца тры часткі — зачын, апісанне і заканчэнне. Структурныя часткі знаходзяцца ў

РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

логіка-семантычных адносінах і звязаны граматычнымі і семантычнымі сродкамі сувязі.

*Людзі жылі тут павольным жыццём, спрадвечным, ціхім... Людское жыццё было, як жыццё гэтага поля навокал і гэтых лясоў. Кожны год зямля мяняла ўсё твар свой. Але праз год яна была той жа самай. І гэта трымала людзей пад нейкаю ўладаю.*

*Кожную восень над гэтым полем і лясамі адляталі жоравы і гусі. Тады людзі глядзелі на гэты свой радасны сум, думалі свае няхітрыя рэчы. Падоўгу стаялі і ўглядаліся ў гэтых адвечных падарожнікаў, якія ведаюць толькі сваю гэтую адвечную дарогу. Але дарога гэтая здавалася людзям незвычайнаю, вольнаю. Можа, людзі зайздросцілі гэтай птушынай волі, можа, яны чулі ў гэты час тое сваё адвечнае імкненне, што жыве ў іх, у глыбіні пад нявольніцкімі путамі гаспадарскай клапатлівасці.*

*Так ішло тут жыццё зямлі і людзей на ёй (*Лявон Бушмар. Т.4. С.38*).*

Зачын (першы сказ) характарызуецца найбольшай самастойнасцю. Спецыфіка яго сінтаксічнай будовы абумоўліваецца неабходнасцю выказаць пачатак думкі, аформіць яго спецыяльнымі сродкамі (у канец сказа перанесены словы *павольным жыццём, спрадвечным, ціхім*, якія выражаюць асноўную думку тэкставага сегмента). Тэма раскрываецца і атрымлівае завяршэнне ў другой апісальнай частцы, якая структурна і сэнсава менш самастойная, бо арыентавана на асаблівасці будовы зачыну і ўсяго ТС. Выкарыстанне займеннікаў яна, гэты, прыслоўяў так, тады, злучнікаў але, і ў пачатку сказаў падкрэслівае структурную і сэнсавую залежнасць кампанентаў апісальнай часткі. Заканчэнне — апошні сказ *Так ішло тут жыццё зямлі і людзей на ёй* — з'ўляецца своеасаблівым кампазіцыйным пунктам, які падводзіць вынік развіццю тэмы, дапамагае акрэсліць ніжнюю мяжу ТС.

Такім чынам, тэкставы сегмент — гэта мікраапавяданне са сваёй тэмай, мікрасюжэтам, аўтаномна арганізаваная частка тэксту, элемент яго структуры. Гэта зладжанае адзінства ЗФА і аўтасемантычных сказаў, арганізаванае па пэўных прыметах і падпарадкаванае пэўным законам функцыянавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аналіз семантыка-сінтаксічных адзінак рознага ўзроўню ў структуры мастацкіх твораў Кузьмы Чорнага, вывучэнне разнастайных тыпаў лексічнай, лагічнай, граматычнай сувязі іх кампанентаў дае магчымасць вызначыць своеасаблівасць індывідуальнай творчай манеры пісьменніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літаратура


1. Зарубина Н.Д. Методика обучения связной речи. М.,1977. С.12.
2. Герасименко А.И. О семантико-синтаксических единицах текста // Системные связи и реализация лингвистических единиц в английских текстах: Сб. ст. Куйбышев, 1980. С.102-112.
3. Баталова Т.М. Соотношение предикативных и релятивных отрезков текста: Автореф. дис. …канд. филол. наук. М., 1977.
4. Бутко В.Г. К вопросу о делимитации тематических отрезков текста (на материале немецкого языка) // Лингвистические проблемы текста и его компонентов в германских языках: Межвуз. сб. науч. ст. Пятигорск, 1983. С.170-179.
5. Вейхман Г.А. Текст и его синтаксические конституенты // Научные доклады высшей школы. Филологические науки. 1989. №4. С.80-82.
6. Солганик Г.Я. Синтаксическая стилистика (Сложное синтаксическое целое). М., 1991. С.153.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ